НАЦЫЯНАЛЬНЫ СУВЕРЭНІТЭТ І РЫНАК

# «...Не нанесці ўрону суседу»



Інтэрв'ю дае Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР, старшыня Дзяржаўнага камітэта Беларусі па эканоміцы і планаванню

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**— Міхаіл Уладзіміравіч, у мяне склалася ўражанне, што ў рэспубліцы з абвяшчэннем дзяржаўнага суверэнітэту пачалі актыўна цягнуць коўдру на сябе. З розных трыбун чуюцца папрокі ў адрас цэнтра аб ушчамленні правоў у розных сферах дзейнасці, імкненні навязаць сваю волю ў эканоміцы і г. д.**

— Я не спяшаўся б рабіць такія катэгарычныя вывады, хоць падобныя меркаванні і не зусім беспадстаўныя. Асобныя міністэрствы і ведамствы СССР з ліку сваіх прадпрыемстваў, размешчаных у рэспубліцы, пачынаюць ствараць саюзныя асацыяцыі, камерцыйныя банкі, акцыянерныя таварыствы. Пры гэтым робіцца ўсё, каб кантрольны пакет каштоўных папер зноў жа знаходзіўся ў «цэнтры». Не адмаўляюцца пры гэтым і ад адміністрацыйнага дыктату. Чаму мяне гэта непакоіць? «Саюзная доля» вельмі значная ў эканоміцы рэспублікі. Гэта 70 працэнтаў асноўных вытворчых фондаў у прамысловасці, 54,5 — таварна-прамысловай прадукцыі, 60 працэнтаў усяго фарміруемага прыбытку. Нават сёння Знешэканомбанк СССР па незразумелых для нас прычынах не пералічвае заробленую валюту на рахункі шэрагу прадпрыемстваў саюзнага падпарадкавання, акумулюючы тым самым у сябе зробленыя ў рэспубліцы сродкі. Ідзі да яго на паклон, як у старыя часы.

Усе гэтыя факты нашы парламентарыі зводзяць у адно, кваліфікуючы, як планамерную акцыю па падрыву суверэнітэту рэспублікі.

Асабіста я лічу, што справа ў іншым. Саюзныя міністэрствы і ведамствы апасаюцца расфарміравання і ў імкненні ўтрымаць уладу кідаюцца ствараць саюзныя асацыяцыі, канцэрны і г. д.

**— Тое, што вы дбаеце пра інтарэсы рэспублікі, — добра, але хто дапаможа «цэнтру», хто яго падтрымае ў гэты нялёгкі пераходны перыяд?**

— Беларусь — і аб гэтым ведаюць, відаць, у любой кропцы краіны — ніколі не замыкалася ў сваёй нацыянальнай «шкарлупіне», не імкнулася жыць за кошт суседзяў. Мы не тое, што ўчора — у сённяшні няпросты час, іншы раз адрываючы ад сябе, сумленна выконваем усе міжрэспубліканскія пастаўкі, дагаворныя абавязацельствы, каб і выпадкова не нанесці ўрону суседу.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

*З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі*